Установа «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці»

Старажытны абрад

«Ваджэнне і пахаванне стралы»

Вёска Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці

Тэкст: Л.Г. Мельнікава
Фота: І.В.Глушэц
Макет К.У. Шіханава
Камп'ютарны набор Н.С. Куляшова
Адказны за выпуск М.І. Шамшэня
Надрукавана ўстановай «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці»
Адрас:246022, г.Гомель, вул. Кірава, 49.
Тэл.77-50-95

г.Гомель
2012

Старое можа быць новым і нават…цікавым. Жыхары Гомеля і вобласці, госці могуць здзейсніць захапляючую вандроўку у сівую глыбіню вякоў, жывую старыну, пабываць на ўваскрашэнні векавой традыцыі, яскравым рытуальным свяце, глыбока звязаным з беларускай зямлею, яе ўрадлівасцю, самім стаць непасрэднымі ўдзельнікамі абраду "Ваджэнне і пахаванне стралы".

Кульмінацыйнае свята стралы прыходзіцца на саракавы дзень пасля Вялікадня, на Ўшэсце, "у чысты чацвер", калі і адбываецца сам абрад пахавання антрапаморфнай стралы.

Па разнастайнасці песень, карагодаў, тэатралізацыі абрадавых рытуалаў, як водгукаў уміласціўлення прыроднай стыхіі – маланкі-стралы, гэты абрад не ведае сабе роўных.

У вёсцы Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці прыбраныя жанчыны, удзельніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта "Казачка" сельскага клуба-бібліятэкі, збіраюцца ў цэнтры вёскі, водзяць карагоды па коле і спяваюць песні.

Канцоўка адной мелодыі нанізваецца на другую, і расце гэты ланцужок, пашыраецца, як і сам карагод.

Вясковыя жанчыны, падзяліўшыся з карагода на роўныя шарэнгі, трымаючы адна адну пад рукі, з песнямі стралы "Як пушчу стралу, вудоль па сялу…" накіроўваюцца за вёску да жытнёвага поля. На памежку, каля яго, сімвалізуючы снапы жыта, рассаджваюцца дзеці ў тры кучы, паміж якімі змейкай, ужо не па коле, жанчыны водзяць карагоды "крывыя танкі", увасабляючы ідэю засцярогі жыцця і прадаўжэння роду. І зноў гучаць песні "З крывога танка не вывяду…". Потым з воклічкамі: "Чыя каша падгарэла?" – спрытна кідаюцца ўдзельніцы крывога танка да дзяцей, падхопліваюць іх на рукі і падкідваюць уверх, што сімвалізуе вышыню будучага ўраджаю. Потым нясуць куляць у жыта, самі бегаюць, куляюцца па жыце, каб не хварэць. Зрываюць тры каласы, бяруць гузікі, манеты і закапваюць на полі жытнёвым, прыгаворваючы: "Ляжы, мая страла, да таго году, каб жывы былі ўсе і здаровы". Загаворваючыя ўпэўнены, што словы абавязкова выклікаюць у іх жыцці або ў прыродзе жадаемы вынік. Наогул жа вельмі моцнае ўздзеянне рэлігійных уяўленняў сказалася ў адным з найстаражытных жанраў вусна-паэтычнай творчасці – у загаворах. І гэта невыпадкова. Ім прыпісваўся магічны моц уздзеяння. У загаворах чуваць водгукі старажытнай веры ў моц слова. Таму вымаўлялі ўжо на прыканцы заключнага рытуальнага дзейства магічнае: "Як прайшла страла ўздоўж сяла, так, каб прайшлі ўсё гора і бяда міма нас!". Зрывала па дзевяць каласкоў кожная жанчына і спявала летнія песні. Потым яны ішлі дадому, дзе клалі каласкі каля абразоў.

Старажылы вёскі расказваюць, што гэты абрад у іх існуе з колішніх часоў. Таму сустрэча жыхароў вёскі Казацкія Балсуны са старажытнасцямі невыпадковасць. Наогул жа архаіка дахрысціянскіх містэрый – спрадвечны калаўрот жыцця, у якім і мы с вамі.

Таму незвычайна, што старажытны абрад "Ваджэнне і пахаванне стралы" вёскі Казацкія Балсуны другім па ліку ў Беларусі атрымаў статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.